Вільня. Серада 20 жніўня. 1924 году.

АБУХ

Цана экз. 10 грош.

БЕЛАРУСКАЯ АДНАДНЁЎКА.

ГОДЗІ МАЎЧАЦЬ!

Кучка нанятых заграніцаю людзей пад фірмаю „арганізаванага беларускага грамадзянства“ у Вільні, ня маючы ніякіх здольнасьцяў да іншае работы, крычыць на ўвесь сьвет ад імя Беларускага Народу, што яму у Польшчы ня добра.

Медналобае стада бараноў гуртом пягнецца за бышым беларускім прэм'ер-міністрам Антонам Луцкевічам, які зьяўляецца тысячнейшым афэрыстам і штучна стараецца трымаць у „чорным целе“ усю бедную беларускую інтэлігенцыю. Але гэта яму пачынае не удавацца. І ён, засыпаны бальшавіцкімі грашыма, кідае ў народ цераз газэту „Сын Беларуса“ дзікую клясавую ненавісьць, сеючы адначасна нацыянальную нецярпімасьць, ловіць у мутнай вадзе рыбку і напіхае кішані чырвонцамі.

Хто ня з ім, ён таго бэсьціць, брэшучы на ўсіх і кожнага. А „заслугі“ яго перад сваім народам вельмі простыя: век ён спэкулюе на народнай цемнаце, гуляючы ў вялікую палітыку і дастаючы на гэта, скуль толькі удаецца, грошы. Калі-ж, часамі, яго цёмных фондаў ня хопе, дык проста пушчаецца на афэры, прадаючы адны й тыя самыя рэчы па некалькі разоў некалькім асобам, як гэта зрабіў у Чэрвені 1923 г. з кватэраю на Віленскай вуліцы № 33.

Годзі маўчаць пра гэтага афэрыста!

А. Луцкевіч, як афэрыст!

Больш як год назад б. старшыня рады народных міністраў Беларускае Народнае Рэспублікі, Антон Луцкевіч, зьвярнуўся да старшыні Беларускага Грамадзянскага Сабраньня гр. Валэйшы з прапазыцыяй, каб адкупіць ад яго, Луцкевіча, памешканьне на Віленскай вуліцы № 33 за адступное у 8 міл. марак. Патаргаваліся і ўмовіліся на 6 міл. з правам карыстацца кніжкамі бібліятэкі, якая там (на Віленскай 33) знаходзілася. Грам. Валэйша зрабіў даклад Радзе старшыняў, каторая і зацьвярдзіла гэтую умову, і былі Луцкевічу выплачаны 6 міл. марак.

Пасьля гэтага перанясьлі патрэбныя рэчы, пераехаў сэкрэтар Грам. Сабр. п. Жаўрыд (які цяпер у Менску) ў тую кватэру і пачалі ўжо гаспадарыць: праводку электрычнасьці зрабілі і іншыя рэмонты. Аж неспадзявана зьяўляецца двух паноў з паліцэйскім і робяць запытаньне, на якіх падставах Грамадзянскае Сабраньне заняло іхняе памешканьне. П. Жаўрыд паказвае паперу, што гэтае памешканьне прадаў А. Луцкевіч за 6 міл. мар., а тыя два паны паказваюць, у свой чарод, паперы што яны раней на год заплацілі 4 міл. мар. за тую самую кватэру. Праз некалькі дзён зьявіўся яшчэ адзін чалавек, каторы заявіў, што яму *яшчэ раней* прадаў Луцкевіч гэтае памешканьне за 3 міл. мар.

Нарэшце зьявіліся: Судзебны Следавацель па найважнейшых справах і Начальнік Падатковага Аддзелу з паліцыяй, дакумэнтальна даводзячы, што гэтае памешканьне з год таму назад зарэквіравана і цяпер лічыцца казённым, і што магістрат аддаў ім, бо Луцкевіч даў на рэквізыцыю згоду.

Тады Прэзыдыум Бел. Грам. Сабр. ў якім быў віцэ прэзэсам найбліжэйшы газэтны супрацоўнік А. Луцкевіча, раэсец п. С., зьвярнуўся да пана Дэлегата Ураду і што-ж аказалася? Аказалася, што гэта ўсё праўда і што проці Луцкевіча п. Дэлегат загадаў пачаць судовую справу за ашуканства, а тымчасам Грамадзянскае Сабраньне выкінулі з купленае ў Луцкевіча кватэры, 8 месяцаў яно ня мела памешканьня, бо і грошы нельга было вярнуць ад Луцкевіча (і цяпер не аддаў яшчэ 1 міл. марак, што заўсёды можна даказаць дакумэнтальна). Дык вось, на ганьбу нашу беларускую, наш бышы прэм'ер-міністар не пастыдаўся нават ашукаць і беларускай інстытуцыі, якая яму цяпер гэтак ня мілая.

Добры быў міністар, але яшчэ лепшы афэрыст.

Ніхто аб гэтым ня пушчаў дасюль публічнае погаласкі, бо падумайце-ж толькі? справа ідзе аб асобу, якая стаяла некалі на чале ўсяго проці-бальшавіцкага беларускага руху.

А цяпер, калі гэтая асоба, маючы ў сваіх бескантрольных руках газэту „Сын Беларуса“ амаль ня ў кожным з апошніх нумароў зьдзекуецца з Беларуск. Грамадз. Сабраньне, абліваючы гразнаю памыйнаю брахнёю каго здумаецца, каб зьвясьці часам свае асабістыя рахункі, мы лічым за абавязак давясьці да ведама ўсяго тутэйшага грамадзянства аб усім вышэй падавым.

Бескантрольная палітыка.

Пара ўжо глянуць на пройдзены беларусамі шлях палітычнага руху, каб зразумець прычыны няўдачаў тых ці іншых „арыентацыяў“, тых ці іншых акцыяў беларускіх вядзёных пад камандаю сапраўднага афэрыста, Антона Луцкевіча, прывыкшага гандляваць інтарэсамі свайго народу ўсё роўна, як уласнаю кватэраю.

Беларускі палітычна-нацыянальны рух, начаты віхрам падзеяў расейскае рэвалюцыі спачатку йшоў чыста ідэйным тэмпам, блізу што бяз ніякае партыйнасьці і ўнутранае калатні.

Але вось у 1918 годзе прабіраецца ў Менск з-пад нямецкае апекі ў Вільні п. Антон Луцкевіч і, абвеяны славаю павадыра беларускага руху, нахрысе і ўпарта ідзе да хоць і провізорычнае яшчэ, але-ж усё-такі беларускае ўлады. Самалюбства яго сказваецца нават у саўсім дробных рэчах, напрыклад, там—дзе справа йдзе проста аб тых, ці іншых назовах.

Гэтак, напрыклад, калі ў канцы 1918 году немцы ачышчалі Менск, і за імі займала яго чырвоная армія бальшавікоў, Антон Луцкевіч дапяў-такі свайго: Рада Беларускай Народнай Рэспублікі даручыла Луцкевічу стварыць беларускі ўрад, які да таго часу называўся Народным Сэкрэтарыятам. Антон Луцкевіч, карыстаючы сваей аўторытэтнасьцю, пачаў з таго, што патрэбаваў ад Рады зьмены назову „Народны Сэкрэтарыят“ на „Народны... Міністэрыум“, проста дзеля таго, каб быць... міністрам.

Стаўшы на чале Рады Народных Міністраў, А. Луцкевіч уцёк перад наступам бальшавікоў з Менску да Вільні, а пасьля, **дастаўшы ад украінскага ўраду Пятлюры чатыры мільёны нямецкіх марак** (гэта ў начатку 1919 году!) паехаў сабе ў Парыж, нібыто на Вэрсальскую Конфэрэнцыю. У Парыжы весела праводзіў час пан старшыня міністраў у таварыстве нейкае княгіні Лівэн. Аб гэтым, прынамсі, пісалася ў гарадзенскай беларускай газэце „Вясковы Пролетары“ (№ 2), што выходзіла падчас выбараў ў Сойм і Сэнат Польскае Рэспублікі, агітуючы за сьпісак № 5 — „Саюзу Пролетарыяту гарадоў і вёсак“.

Пасля заняцьця Менску польскаю арміяй, пан старшыня Рады Народных міністраў А. Луцкевіч прыбыў у Менск, дзе ўжо згуртавалася Рада Беларускай Народнай Рэспублікі, якая першым чынам патрэбавала, як агульнае так і грашовое справаздачы ад прэм'ер-міністра Ант. Луцкевіча, адказвальнага перад Радаю за свой урад. Ант. Луцкевічу, прывыкшаму распараджацца беларускімі справамі лягчэй і безкантрольней, як сваею ўласнаю кішэняю, гэткая рэч тады неспадабалася і, на проекту аднаго з найспрытнейшых сваіх міністраў, ён простым шляхам пастараўся зьліквідаваць Раду Рэспублікі, стварыўшы націкy Дырэкторыю з пяцёх чалавек, якая называлася, Найвышэйшаю Радаю Рэспублікі.

За гэтак спрытна пастроенаю шырмаю — гэтаю Найвышэйшаю Радаю — п. Луцкевіч, застаючыся прэм'ер-міністрам, пачынае сваю... нібыто „полёнофільскую“ палітыку. Уся гэта палітыка была пастроена на няшчырасьці і карыстаньні з тых ці іншых субсыдыяў прыхільнае тады да беларускага антыбальшавіцкага руху польскае ўлады.

Пачалася нейкая незразумелая чэхарда. Беларуская інтэлігэнцыя грамадой кінулася ў, створаную Дэкрэтом Галоўнага Павадыра Польскага Войска, Беларускую Вайсковую Камісію, каб стварыць збройную родную сілу. А Найвышэйшая Рада, скачучы пад дуду Ант. Луцкевіча, заключае ў Вільні дагавор з прадстаўніком польскага ўраду, на чале якога стаяў п. Скульскі.

Ня высахла яшчэ чарніла подпісаў на дагаворы, п. Скульскі заяўляе інтэрвьюэрам, што беларусы жадаюць у Польшчы максімум нацыянальна-культурнае аўтаноміі ад польскае ўлады і што гадоў цераз 50 беларускае пытаньне ў Польшчы перастане саўсім істнаваць.

Калі, гэткім чынам, тайная дыплёматыя п. Луцкевіча і Дырэкторыі пачала вылазіць наверх, дык раптам Беларускі Нацыянальны Камітэт у Менску закаціў моцны протэст проці інкорпорацыі Беларусі ў склад Польшчы, памінаючы заяву п. Скульскага.

Усё гэта нішто. Але-ж трэба ведаць, што на чале Менскага Нацыянальнага Беларускага Камітэту стаяў тады ў 1919—1920 г.г. адзін з сяброў Найвышэйшае Рады, — ён-жа й міністар кабінэту Антона Луцкевіча. А вёўшы ў Меншчыне нацыянальную пропаганду і выдаваўшы вялікую штодзенную газэту. Нацыянальны Камітэт істнаваў хіба што не на ўласную кішаню п. Луцкевіча?

Так ці гэтак, а няшчырасьць „орыентацыі“ міністраў Луцкевіча і Найвышэйшай яго рады кінулася польскім уладам у вочы і ўсякая беларуская акцыя ў Польшчы была засуджана на поўнае банкруцтва.

Якжа-ж магло быць іначай, калі з аднага боку дагавор, а з другога протэст.

Застаецца фактам, што аб чатырохмільённай пэтлюраўскай пазычцы „бышы прэм'ер-міністар“ А. Луцкевіч ніякае справаздачы беларускаму грамадзянству а ні Беларускаму Народу нідзе ніколі не зрабіў, хаця імем цёмнага Беларускага Народу пазычка гэта была ім дабыта. Аб гэтым

ужо пісалася ў газэце „Голас Грамадзяніна“ за 6 студня 1922 г., тут у Вільні падчас перадвыбарнае акцыі ў Віленскі (Сярэдня літоўскі) Сойм, Луцкевічам і яго партыяй байкатованы.

Цяпер-жа, тых хто ня ведае ўсяе гэтае „палітычнае мудрасьці“ бышага беларускага прэм'ер-міністра А. Луцкевіча, гэты-ж самы Луцкевіч круціць як толькі хоча, камандуючы людзьмі, як пешкамі, гуляючы ў нейкую высокую палітыку, якая пэўна-ж не задарма робіцца. Маючы ў руках газэту „Сын Беларуса“ разам са скончаным алькоголікам Мікалаем Шылам і лічачы сябе „непагрэшнымa“ чыстым дзеячом, А. Луцкевіч не разьбіраецца ні ў якіх спосабах, каб зьвясьці свае асабістыя рахункі з тымі, хто калі-нібудзь ці цяпер не згадзіўся, або не згаджаецца скакаць пад яго дудку.

Няшчасны Беларускі Народзе! Калі-ж ты прадзярэш вочы і ўбачыш, як гуляе „паміністэрску“ Тваім вялікім Імем просты дробны афэрыст, апракуўшыся ў тогу вялікага беларускага дзеяча. Калі пачуецца Тваё катэгорычнае, гаспадарскае слова:

„Годзі!“

А тады толькі і можа скончыцца высокая беларуская (?) бескантрольная палітыка „арганізаванага“ беларускага грамадзянства, арганізованага А. Луцкевічам.

Я. Ш.

Рэдактар Шыла.

Хто ня знае гэтае арыгінальнае фігуры, якая з вечным пахам гарэлачнага бровару часта кідаецца ў вочы публікі сваею кучаравaю, нічым непакрытаю, галавою, скуючы па віленскім бруку?

Хто пацікавіўся моральным зьместам скалечанае, струхлелае душы пяперашняга рэдактара „Сына Беларуса“ Мікалая Шылы, які, будучы беларускім соцыялістам-рэвалюцыянэрам (коратка эс-эрам) і зьяўляючыся праз гэта яўным палітычным працаўнікам „найвышэйшага“ беларускага палітыка Антона Луцкевіча, дакаціўся да таго, што стаў сьляпым інструмэнтам у руках апошняга, засланяючы сабою, як нейкаю вельмі дзіраваю шырмаю, яго газэтныя трюкі?

Можа ніхто й ня цікавіўся! Можа ніхто не падумаў аб крывой ці ломанай лініі жыцьцёвага шляху гэтага экс-рэдактара, аб якім можна сказаць словамі мудрае народнае прыказкі: „Валі на бурага—буры ўсё зьвязе!“.

І ён вязе. Вязе ўсё, што толькі на галаву звалiцца. Валазе, яна заўсёды саўсім адкрытая ды ў дадатак... ніколі недьвярося.

А некалі-ж і ён быў не такім. Спарадзіла яго на сьвет чэсная беларуская маці, бацька на апошні мазольны мужыцкі грош стараўся, як толькі мог, адукаваць яго, паслаўшы ў Маладзечна ў настаўніцкую сэмінарыю.

І, можа, хто сьмее сказаць, што ніколі ў душы рэдактара Шылы ня было нічога ідэйнага?

Не! гэтага сказаць нельга.

У юнацкія гады, дзякуючы прасьвеце, Мікалай Шыла, прадраўшы свае мужыцкія вочы, пабачыў, што пад царом роднаму народу дрэнна было.

Пабачыў і пачаў бароцца з ліхам.

За прыналежнасьць да расейскае партыі соцыялістаў-рэвалюцыянэраў Мікалай Шыла быў царскаю ахранкаю арыштованы і лепшыя гады свайга маладога веку правёў у Менскім вастрозе, на Серпухаўскай вуліцы.

Выбіты з каляіны, ён пайшоў на сусьветную вайну; ў Керэншчыну арганізоўваў беларускія салдацкія масы агніўшае расейскае арміі і быў, як здавалася, на шляху да адраджэньня, як гэта аб сабе любілі казаць некаторыя з герояў расейскага літэратара Максіма Горкага.

У тую-ж самую керэншчыну, Мікалай Шыла апынуўся аж на самай гары беларускага руху, дайшоўшы да цеставаньня мандату сябра Рады Беларускае Народнае Рэспублікі.

Рада Рэспублікі была бедная, як царкоўны пацук; сяброўскі мандат ня мог гарантаваць Мікалаю Шыле простага кавалка будзеннага хлеба. Жыцьцёвых здольнасьцяў, апрача толькі выпівальных, у яго не заўважалася...

Аж пачалі неяк з беларускага міністэрыуму пры Радзе Рэспублікі зьнікаць адна за аднэю пісальныя машынкі — „Рэмінгтоны“, „Ундэрвуды“ і г. д.

Хадзіла дзейка, што гэта работа Шылы да яшчэ аднаго кампана яго па партыі.

Пагутарылі, пабедавалі дый пастанавілі маўчаць, бо людзі гулялі ў дзяржаўныя справы і мусілі маўчаць...

Пасьля нейкага часу бязьдзейнасьці, начала ў Менску ізноў зьбірацца Рада Рэспублікі, карыстаючы з таго, што Менск заняла Польская Армія, прагнаўшы адтуль бальшавікоў, абвясьціўшых Раду „вне закона“.

Пачала ажываць беларуская культурная работа. Заложылася на Захараўскай вуліцы ў доме Рады Рэспублікі рэдакцыя штодзеннае беларускае газэты.

У адзін прыгожы дзень Шыла разам з сваім ня так партыйным, як алькогольным таварышом даставіў у рэдакцыю пісальную машынку ліха ведае якога паходжаньня. Рэдакцыя, панатужыўшыся, купіла машыну.

У другі прыгожы дзень зайшоў у Рэдакцыю адзін коопэратар-беларус з партыі хрысьціянскіх дэмакратаў і, глянуўшы з аднаго—з другога боку на машынку, пачаў качацца на ўсіх сталох, заходзячыся ад сьмеху.

— Чаго вы? — пытаецца ў гэтага коопэратара рэдактар.

Адказу ня чутно, млее коопэратар ад сьмеху яшчэ горш, яшчэ мацней.

Прыйшоўшы да прытомнасьці, ён зьвяртаецца да рэдактара:

— Пане Рэдактару! Сьмешна. Далібог сьмешна, але і прыкра неяк. Ці ня Шыла з . . . . прадаў вам гэтую машынку? Яна мне саўсім знаёмая. Яна — ўласнасьць . . . . назваў сьмяшлівы хрысьціянскі дэмакрат прозьвішча віднага менскага дзеяча па коопэрацыі.

Схапіліся за галаву, але й на гэты раз маўчалі. А Шыла са сваім прыяцелем прыпёр у рэдакцыю яшчэ адну пісальную машынку, так сабе... няхай пастаіць. Як ні протэставаў рэдактар, а машына недзе ў кутку пару начэй прастаяла.

У адну нястрашную ноч абедзьве машынкі з рэдакцыйнага пакою зьнiклі. Адну (прададзеную і лепшую) спрытныя рукі пасьцелі праз вакно выцягнуць, а другая павісла на вакне і была проста вернена Шыле й кампану яго, як іхняя ўласнасьць. Другі раз рэдакцыя, страціўшы адну машынку, не схацела купіць другое.

Памахаў рэдактар рукамі, пакрычаў, папляваў на падлогу дый напісаў у паліцыю паперу аб кражы з рэдакцыі машынкі, падаючы пры гэтым падазроных асоб...

Ліха яго ведае, хто сьвіснуў з рэдакцыі машынку, але хто яе прадаў туды было-ж ведама. Ні Шыла, ні кампан яго ніякае фабрыкі пісальных машын ня мелі і прадстаўнікамі ніякіх фірмаў „Ундэрвуда“ ці „Рэмінгтона“ ня былі.

Адступленьне і выхад польскіх уладаў з Менску перашкодзіла паліцыі давясьці сьледзтва аб машынках да канца.

І ліха яго, нарэшце, ведае, як там з гэтымі машынкамі было. Толькі адно зьяўляецца фактам, што Шыла нейкімі машынкамі гандляваў.

Невядома, ці гандляваў ён імі пры бальшавікох, але тут можа і патрэбы ня было, бо Шылу бальшавікі вагначылі чуць ня дыктатарам на нейкі павет па выкараненьні няпісьменнасьці.

Усё было-б добра, але гарэлка ў бальшавікоў забаронена і Шыле прышлося зрабіцца „дезертиром труда“. Ён уцёк у пачатку 1921 году сюды.

— Хоць гол ды весел, — кажа сабе рэдактар Мікалай Шыла і, ня маючы (дый ня меўшы ніколі) ніякага ў жыцьці соцыяльнага палажэньня, думае зрабіць „сваім“ „Сынам Беларуса“ і нацыянальную і соцыяльную рэвалюцыю...

Але-ж хіба толькі ў сваёй п'янай кучаравай галоўцы, сапраўды вартай паспалітага жалю.

Менскі.

Чаму гэта?

У працягу 11 гадоў гр. Валэйшу выбіралі восем разоў сваім старшынёю. Выбіралі яго ня так, як цяпер выбіраюць у Нац. Кам., а агульнымі сходамі а яго і Луцкевіч, і Самойла і Рак-Міхайлоўскі—ўсе дзеячы і паслы цяперашнія галасавалі. Валэйша „багаслаўляў, адпраўляючы ў Сойм паслоў, ня было ніводнае арганізацыі, ў каторай Валэйша ня быў сябрам ураду, за яго усе беларускія газэты стаялі сьцяной,—а цяпер „Сын Беларуса“ яго лае, выдумываючы розныя нябыліцы.

Чаму гэта так? А ось чаму. Валэйша жадае дабра для беларускага народу, ён за грошы не прадасьць сам сябе і другіх і калі ён увідзеў што кампанія Луцкевіча разам з пасламі прадалася бальшавіком, ня робяць ніякае рэальнае працы, а толькі п'янствуюць і мітынгі робяць па указцы бальшавікоў, тады Валэйша выдзяліўся з гэтае бруднае кампаніі, і, ня гледзячы на тое, што ў працягу 4 месяцаў вяліся перагаворы, каб скланіць яго да згоды, Валэйша не пашоў з імі, ось тады і пашла лаянінка, а калі Валэйша „монарху“ А. Луцкевічу публічна заплявуху даў за паклёпы, тады сталі выдумліваць розную глупасьць на яго, думаючы, што ён можа здасца. Але, як нагрэх, Валэйша не здаецца.

Ось уся прычына, пакаторай вядомы афэрыст Луцкевіч разам з наёмным рэдактарам такім-жа злодзеем і п'яніцай Шылам — па прыказаньні бальшавікоў — лаюцца у газэце „Сын Беларуса“, каторая выдаецца за бальшавіцкія грошы.

Якіх людзей Луцкевіч у паслы выцягнуў.

Шмат красамоўных прамоў казаў п. Луцкевіч, калі ўжо меў у кішэні падпісаную ўмову з жыдоўскімі капіталістамі пэконта блёка нацыянальных меншасьцяў, сваім сябром якія седзячы слухалі яго, як бога. Мне маленечкаму чалавеку ня раз прыходзіла на думку: чаму гэта беларускі рух ня мае ніколі аднэй простай дарогі, чаму ён стаецца, быццам сьляпы і чаму усе павінны слухаць аднаго чалавека які, ня пытаючы нікога, робе ўсё што яму прыдзе ў галаву? Цікава вельмі цікава!? Чым усё гэта скончыцца — меркаваў я тады. Але ось прайшло два годы і ужо нават добра відаць канец усей Луцкевічскае авантуры з многапакутным рукам беларускім. Луцкевішчына завела яго у такі тупік, з якога ня хутка выйдзе і ці выйдзе — гэта пытаньне яшчэ?

Састаўляючы спісак паслоў п. Луцкевіч зрабіў яго гэтак, каб галасамі бедакоў беларусоў прайшлі ў Сойм, тыя капіталісты, якія нават ня прызнаюць беларусоў! Але ось цікава, чаму яны адтрымалі ў п. Луцкевіча мандат на беларускасьць? Вельмі проста мае паночкі, калі хочыце ведаць колькі дубку гадкоў, дык трэба яго сьсекчы. Так сама і тутака падабраў ён у паслы добрую кампанію, каб круціць ёю як сам захоча і ня дзіва што у Сойм папалі: 1) былы сябар саюза рускага народа, нават хаўрусьнік Балаховіча, якога так ня любіць п. Луцкевіч, літоўскі шпіён Якавюк. 2) Разгоншчык беларускага зьезду у Смаленску з чыста маскоўскім духам п. Рагуля. 3) п. Назарэўскі — маскаль якога ня відаць было сярод беларускага руху ніколі. 4) п. Багдановіч, няведаючы якому Богу маліцца і ніколі ня бываўшы дзеячом беларускім. 5) п. Мятла і шмат яшчэ яскравых „дзеячоў“, якіх п. Луцкевіч паслаў у Сойм рабіць справу беларускую. Дык ня дзіва, што яны нічога не зрабілі, бо маючы на мэце рабіць завароты галоў п. Луцкевіч, так закруціў галовы сваім паслугачом, што яны ужо мусіць і не адкруцяцца ніколі...

Дый робючы усе свае жыцьце завароты галоў п. Луцкевіч мусіць і сабе добра закруціў мазгі, шкада толькі чаму разам з мазгамі ён ня скруціў сабе галавы — гэта было-бы з яго боку найлепшай справай зробленай ім на карысьць Бацькаўшчыны.

Казноўскі.

З газэт.

„Ворагі беларускай справы“.

Пад гэтым загалоўкам газэта-аднаднеўка „Голас Грамадзяніна“ 6 студня 1922 году пісала ў Вільні літаральна вось што:

„Што за людзі сядзяць у Прэзыдыуме Беларускага Нацыянальнага Камітэту?

Хто яны? хто меў ім права выдаваць ад імені арганізаванага беларускага грамадзянства пастановы? Хто яны, гэтыя падфарбованыя беларусы, ваўкі ў авечай скуры?

А вось хто яны:

1) **А. Луцкевіч.** Яшчэ з часаў царскіх меў сувязь з нямецкай гакатай. Ім была зроблена ў украінцаў пазычка на 4 мільёны, з якое ён ня здаў нават адчоту, ня гледзячы на затрэбаваньне Рады Рэспублікі на паседжаньні ў грудні 1919 г.“.

І далей „Голас Грамадзяніна“ пералічае розных, набраных Луцкевічам на пракат, статыстаў, у ліку якіх навет знайшліся і чыстыя маскалі.

ХРОНІКА.

— **Пасьля балю ў Дырэктара гімназіі.** ня так, каб зусім заліўшы вочы, але вы піўшы ў меру і туга, нашыя дзеячы задумалі пазабаўляцца і ось па праекту п. Алёны пачалі гуляць у „курыцу і шчупака“. Разбудзілі дзяцей у прытулку, з каторых выставілі варту, агонь пагасілі і пашла папоцёмку гульня. Пані Алёна злавіла шчупака ў пасла Кс. А., а п. Дырэктар гімназіі злавіў у пані Алёны курыцу. Маруся Ш. закрычала, што шчупак да ея даўно належыць. Пані Алёна не уступала і падарапаліся бабы.

Відаць добры быў шчупак, калі бабы падраліся. А цятка галодная мусіла пільнаваць дзьверы. Назаўтра вучыцелька, каторая складала кніжкі, толькі рукамі разьвяла, бо ўсе кніжкі ў бібліятэцы былі параскіданы.

Чытай, беларусе, праўду аб афэрыстах, якія муцяць табе мазгі, а у цішы сваіх каморак пацiраюць рукі, што цябе яшчэ за нос вадзіць можна!

Як гэта зразумееш, дык лёс твой будзе залежаць ад цябе самога!

Рэдактар-выдавец Я. Шалакоўскі, Віленская вул. дом № 12.

Друкарня „Lux“ вул. Жэлігоўскага 1. Тэлеф. № 263.